Перасылка аплочана рычалтам

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі Вільня, Літоўская вул. № 25—1.

Рэдакцыя і Адміністрацыя адчынены у панядзелкі, серады і суботы ад г. 9 да 12 г.

ШЛЯХ

ЦАНА АСОБ. НОМ. 15 ГР.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на месяц — — 0,50 гр.
у паўгодкі— — 2.50 „
у год — — — 5.00 „

ЦАНА АБВЕСТАК паводле ўмовы. Для інстытуцыяў, грамадзкіх арганізацыяў і шукаючых працы значная зьніжка.

НАРОДНАЯ, ПАЛІТЫЧНА-ЭКАНАМІЧНАЯ І ГРАМАДЗКАЯ ГАЗЭТА.

№ I. Вільня, Пятніца, II-га лістапада 1932 г. Год I.

Такі ўжо злажыўся звычай, што кожная нова—выходзячая часопіс першыя свае радкі пасьвячае вылажэньню хоць-бы ў каротках словах тае думкі, якую мае рэпрэзантаваць.

Аддаючы ў рукі нашых чытачоў № 1 „Шляху“ падпарадкаваемся гэтаму звычаю і мы.

Паміма раду нязгрыяючых чыньнікаў за апошнія гады нацыянальная сьведамасьць шырокіх беларускіх масаў у нашай краіне ня толькі не пагасла, але наадварот, якраз у гэты мамэнт выявіла сваю здольнасьць да жыцьця. Адначаена ў блізкіх і далёкіх нашых суседзяў, на ўсёй зямной кулі адбываюцца падзеі, якія ня могуць не зрабіць паважнага, а можа і рашаючага ўплыву на лёс нашага народу і якімі ня могуць не цікавіцца шырокія беларускія масы. У такіх варунках існаваньне газэты, якая-б у роднай мове, у найбольш даступнай форме ў рамах існуючых магчымасьцяў давала інфармацыі аб палітычным, эканамічным і грамадзкім жыцьці цэлага сьвету і была-б выразам ідэалёгіі найшырэйшых слаёў насельніцтва Заходняй Беларусі — зьяўляецца палючай патрэбай. Існуючыя беларускія газэты ні ў якай меры ня могуць задаволіць гэтай патрэбы. Таму, сьведамы важнасьці гэтай задачы, „Шлях“ бярэцца за яе выкананьне.

Зрабіць гэта аднак зможа толькі пры самым дзейным матэр'яльным і моральным падтрыманьні шырокіх слаёў народу. Мала таго, „ШЛЯХ“ УЗАЛЕЖНІВАЕ СВАЕ ІСНАВАНЬНЕ АД ГЭТАГА ПАДТРЫМАНЬНЯ. Таму тут-жа зварочываемся да ўсіх, каму дарагая самастойная прэса, да ўсіх сьведамых беларусаў з гарачым заклікам:

Прысылайце безадкладна нам артыкулы, карэспонденцыі, прысылайце падпісную плату, калі не з уласных сродкаў кожнага паасобку, то ў СКЛАДКУ.

Верым, што наш заклік знойдзе належны водгук. Верым, што наш высілак народ зразумее, ацэніць і возьме сваю справу ў свае рукі. З гэтым перакананьнем прыступаем да працы.

РЭДАКЦЫЯ.

Вынікі выбараў у Нямеччыне.

6 г. м. адбыліся другія ў г. г. выбары ў нямецкі парлямант (Райхстаг). Далі яны наступныя вынікі ў параўнаньні з папярэднімі выбарамі:

ПАРТЫІ	Лік галасоў у ліпнёвых выбарах.	Лік галасоў у лістапад. выбарах.	Прырост (+) упадак (—)	Лік мандатаў у мінул. выбар.	Лік мандатаў у лістап. выбарах.	Прырост (+) Упадак (—)
Нацыянал.-сацыял. — — — — —	13,732,413	11,705,256	—1.982157	230	195	— 35
Сац.-дэмакраты — — — — — —	7,949 883	7,231,404	— 718,479	133	121	— 12
Камуністы — — — — — — —	5,276,882	5,970,833	+ 693,951	89	100	+ 11
Цэнтр — — — — — — —	4,600,895	4,228,322	— 372,573	75	70	— 5
Нямецка-народная — — — — —	2,174,071	3,061,626	+ 987,555	37	51	+ 14
Баварская нар. партыя — — — —	1,179,717	1,081,595	— 98,127	22	18	— 4
Нямецкая-людовая — — — — —	436,337	659,703	+ 223.366	7	11	+ 4
Хрысьц.-сацыялісты — — — — —	362,331	412,523	+ 50,192	4	5	+ 1
Дзяржаўная партыя — — — — —	374,816	337,871	— 36,945	4	2	— 2
Гаспадарчая партыя — — — — —	146,370	110,117	— 36,253	1	2	+ 1
Сялянская партыя — — — — —	—	105,188	—	2	3	+ 1
Ляндфольк — — — — — — —	—	46,486	—	1	—	— 1
Ляндбунд Тюрынгіі — — — — —	—	60,065	—	—	1	+ 1
Гановэрчыкі — — — — — — —	—	63,999	—	—	1	+ 1
Віртэнбэрская сял. партыя — — —	—	105,188	—	—	2	+ 2
Іншыя — — — — — — — —	—	134,409	—	—	—	—
Разам галасоў— —	36,976,219	35,379,011	мандатаў:	607	582	—

Выбары адбыліся ў надзвычай напружаных грамадзкіх адносінах. Найбольш характэрным фактам у іх ёсьць заламаньне росту ўплываў нац.-сацыялістаў, якія пасьля гігантычнага росту цяпер страцілі аж 35 мандатаў; далейшы ўпадак уплываў сацыял-дэмакратаў і сталы, але больш шпаркі, рост камуністычных галасоў. У сувязі аднак з значным зьмяншэньнем ліку галасуючых адносныя здабычы і страты паасобных партыяў зьяўляюцца большымі, чым аб гэтым гавораць пададзеныя цыфры.

У самым Бэрліне, на агульную колькасьць 2.722.618 галасоў, камуністы здабылі найбольш: 860.579 гал., далей нац.-сацыялісты—719.749, сац.-дэмакр.—646.266.

Адкрыцьцё сэсіі Сойму.

Дня 3 г. м. адкрылася звычайнае паседжаньне Сойму. З вялікай прамовай выступіў мін. Скарбу п. Завадзкі, які гаварыў аб гаспадарчай сытуацыі краю і аб бюджэце на 1933—34 г. Даходы ў ім прадбачацца на 2 мільярды 88 міл. зл., выдаткі — 2 мільярды 449 міл. зл. Такім чынам дэфіцыт выносіць 360 міл. зл.

Пленарнае паседжаньне Сойму агранічылася ўсяго толькі да аднаго дня, пасьля чаго, на падставе распараджэньня Прэзыдэнта Рэспублікі было адтэрмінавана на 30 дзён. На гэту тэму напішам больш у наступным нумары.

Працэс Браніслава Тарашкевіча.

Як падае прэса, суд над Браніславам Тарашкевічам, б. послам і б. старшынёй Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады — адбудзецца дня 28 г. м. у Віленскім Акружным Судзе. Б. Тарашкевіч быў арыштаваны ў лютым 1931 г. ў Тчэве, калі з Нямеччыны праяжджаў праз Польшчу. Разам з Б. Тарашкевічам будуць судзіць яшчэ некалькі асоб.

Новая беларуская арганізацыя.

Як даведываемся, у першай палове кастрычніка г. г. у м. Беластоку адбыўся сход ініцыятыўнай групы беларускіх работнікаў, на якім было пастаноўлена залажыць кооперацыйнае культурна-асьветнае і выдавецкае таварыства „Сяўба“ з сядзібаю ў Беластоку і з абшарам дзеяльнасьці ўва ўсей Польшчы. Статут „Сяўбы“ ужо залегалізаваны і яна прыступіла да дзеяльнасьці. Згодна з нашымі інфармацыямі, у Вільні мае быць у хуткім часе заложаны аддзел „Сяўбы“.

(Працяг на 2-ой стр.)

ШЛЯХ НАРОДУ — НАШ ШЛЯХ.

Беларускі нацыянальна адраджэнскі рух за апошнія гады прайшоў засяг гісторыі, засяг, які, запраўды, можа служыць найлепшым доказам яго жывучасьці і сілы. Гісторыя гэтых гадоў даказала кожнаму, што народна-вызваленчы рух гэта ня штучны твор рук і галоў паасобных выдатных адзінак—палітыкаў, але рух натуральны, абумоўлены разьвіцьцём грамадзтва, рух, які аджыўляецца сокамі, ідучымі з жывой крыніцы — нацыянальных і сацыяльных варункаў быту шырокіх народных масаў нашага краю. Шлях пройдзены за апошнія гады — гэта шлях, паміма частых зыгзагаў, просты і ясны, шлях, маючы перад сабою акрэсьленую мэту — імкненьне да выхаду з існуючага палалажэньня, да папраўы нацыянальнага і соцыяльнага быту народу.

Бушуючы экономічны крызіс амаль у-ва ўсім сьвеце, у нас — на Заходняй Беларусі прыбраў асабліва шпаркія тэмпы ў зьвязку з цэлым радам асаблівых момантаў, уласьцівых нашай гаспадарцы, якія надаюць ёй выдатна адсталы сельска—гаспадарчы характар. Нябывалае зьніжэньне цэнаў на сельска-гаспадарчыя продукты, упадак прамысловасьці ў гарадох, брак адходных заработкаў для значнай часткі вясковага насельніцтва, а ў сувязі з гэтым перапаўненьне вёскі і гораду арміяй безпрацоўных — усё гэта ў яшчэ большай меры пагаршае і без таго нялёгкі стан шырокіх слаёй народу на нашых землях. Гэты абраз з свайго боку дапаўняецца амаль поўнай адсутнасьцю роднай школы, амаль поўным бракам нацыянальна-шчырых культурна-асьветных арганізацыяў, недахопам кніжкі і прэсы ў зразумелай для народу роднай беларускай мове. Варункі гэтыя акрэсьліваюць сабою тую праўдзівую, рэальную аснову, на якой апіраецца нацыянальна-адраджэнскі рух.

Рух гэты — гэта рух масавы, рух аснаўных слаёў народу. І таму, паміма вялікіх труднасьцяў, стаўляных на яго шляху, ён ня можа быць стрыманы, ён стала, перамагаючы ўсялякія хвілёвыя недахопы і труднасьці, ідзе да сваей мэты. Так бывае з кожным, запраўдным рухам мас. Каляса гісторыі павярнуць назад ня зможа наймагутнейшая рука найбольш гэніяльнай асобы.

Нацыянальнае ўсьведамленьне шырокіх мас беларускага народу ўзрастае побач з узростам сілы наступу на яго ўсіх супраціўных чыньнікаў, як звонку, так і знутры. Сума выпадкаў на працягу апошніх гадоў зьяўляецца найлепшай ілюстрацыяй гэтага. Імкненьне да здабыцьця роднае школы, выступленьні ў абарону існуючых беларускіх школаў, змаганьне за паправу свайго матэрыяльнага быту — вось коратка, у агульных словах, той шлях, па якім ішлі, ідуць і пойдуць народныя гушчы нашай краіны.

Народ абяднаны аднолькавымі варункамі нацыянальна-соцыяльнага быту, імкнецца да свае мэты, мае свае ідэалы, да рэалізацыі якіх прыкладае ўсе высілкі. Імкненьні гэтыя паралізуюць пасьпяховую працу тых чыньнікаў з — пасярод беларускага грамадзянства, якія стараліся і стараюцца, вывешваючы шыльды народных мучанікаў, павясьці масы па шляху, ня маючым нічога супольнага з праўдзівымі нацыянальна-адраджэнскімі ідэаламі. У гэтым натуральным імкненьні мас вельмі важным дапаможнікам зьяўляюцца арганізацыі, твораныя самым народам, арганізацыі, абядноўваючыя ў сваіх шэрэгах яго найбольш сьведамую частку. Арганізацыі гэтыя зьяўляюцца сапраўднымі сьветачамі, кіраўнікамі і выкальнікамі нацыянальна-адраджэнскага ўсьведамленьня. Бяз іх народ застаўся-б да пэўнай меры распыленай масай і на яго нядолі маглі-б больш пасьпяхова нажывацца тыя, хто няпрыхільна адносіцца да праўдзівых народных ідэалаў. Мы будзем старацца групаваць навакола нашай газэты людзей, адданых справе шырокіх мас беларускага нороду, усіх тых сьвядомых грамадзян, каму запраўды дарагая справа будучыні нашай краіны, — усіх тых, хто шчыра хоча зьліцца з народнымі масамі і пайсьці з імі па супольным шляху, да супольных мэтаў.

Шлях шырокіх народных масаў нашай краіны тады толькі станецца нашым шляхам, калі імкненьне да ідэалаў народу будзе штодзеннай нашай працай.

Забастоўка рабочых гарадзкой камунікацыі ў Бэрліне.

У Бэрліне — сталіцы Нямеччыны — 3-га кастрычніка г. г. выбухла агульная забастоўка рабочых гарадзкой камунікацыі, у якой прынялі ўдзел звыш 20 тысячаў рабочых. Забастоўку арганізавалі супольна камуністычныя, сацыял-дэмократычныя і гітлероўскія рабочыя, творачы забастовачны камітэт. Штрайк выкліканы імкненьнем бэрлінскай камунікацыйнай дырэкцыяй да абніжкі платы і рэдукцыі працаўнікоў. Зараз-жа пасьля абвешчаньня забастоўкі ўсе гаражы і най больш стратэгічныя камунікацыйныя пункты былі абстаўлены моцнымі аддзеламі штрайкуючых так што ў першыя дні штрайку на места ня выехаў амаль ніводзін аўтобус, ані трамвай. Таксама пуставалі і падземныя калейкі. Урад у паразуменьні з дырэкцыяй на другі дзень забастоўкі выдаў загад аб ліквідацыі яе, пастанавіўшы абнізіць плату на 2 фэнігі за гадзіну працы. Аднак паміма жорсткіх загадаў дырэкцыі і ўраду штрайку зьліквідаваць не ўдалося. На помач дырэкцыі прышлі сацыял-дэмократычныя профэсыянальныя саюзы, якія заклікалі рабочых да ліквідацыі забастоўкі і прыступленьня да працы на варунках, падыктаваных урадам Папэна. І гэта не памагло. Забастоўка трывала далей.

У шмат мяйсцох адбыліся вострыя сутычкі работнікаў з паліцыяй падчас якіх 6 асоб забіта і шмат ранена. На аднэй вуліцы работнікі пабудавалі з вазоў барыкады і затрымалі ўвесь рух; шмат дзе паперарывалі электрычныя драты, якія злучаліся з трамваямі. З 10 выехаўшых у часе забастоўкі аўтабусаў, 9 зьнішчана каменьнямі, пасьля чаго аўтабусы больш не рызыкавалі выжджаць. Толькі ў пэўныя гадзіны нерэгулярна курсавала некалькі пустых трамваяў, пад моцным надзорам паліцыі. Публіка з іх не карыстала, баючыся нападаў з боку штрайкуючых.

На трэці дзень забастоўкі дэрэкцыя камунікацыі на аснове распараджэньня ўраду выдаліла з працы каля тысячы рабочых. Гэта яшчэ больш завастрыла сытуацыю. Групы работнікаў у начы пазалівалі ў некаторых мясцох трамвайныя шыны гіпсам, дзякуючы чаму рух адбывацца ня мог. Паўтараюцца вострыя сутычкі бастуючых з паліцыяй. У сувязі з гэтым праведзены масавыя арышты рабочых.

Паводле апошніх вестак штрайк кончыўся 9 г. м.

Па шырокім сьвеце.

Крызіс і міжнародная гаспадарчая канфэрэнцыя.—Францыя і Нямеччына. — Палажэньне ў Нямеччыне. — Выступленьне безработных у Англіі.

Часы, у якіх жывём, багаты вялікімі падзеямі. Найменш граматны чалавек можа заўважыць, што ў сусветнай машыне нешта сапсулася і сапсулася так, што невядома ці ўдасца направіць.

Ужо вось трэці год усе афіцыяльныя палітыкі і эканамісты ламаюць галаву над тым, як перамагчы нячуваную ў гісторыі па сваей вялічыні патвору — эканамічны крызіс, г. зн., як ўратаваць сучасны сьвет і лад.

А патвора гэтая нарабіла нявіданых спусташэньняў. Большасьць фабрык стаіць бясчынна. Мілёны безработных. Тавары кучамі ляжаць на складах, а распрадаць іх няма магчымасьці. Сяляне, гэтыя найбольшыя купцы прамысловых прадуктаў, амаль што зусім перасталі купляць: цэны на іх прадукты ўпалі, біднейшым няма дзе зарабіць, а трэба-ж яшчэ плаціць падаткі і аддаваць пазычкі. Даходы дзяржаў малеюць. Растуць дэфіцыты, г. зн. перавышкі расходаў над прыходамі. Цэлай газэты не хапіла-б, каб пералічыць усё тое, што нарабіў крызіс.

З мэтай барацьбы з крызісам мае быць склікана ў лютым будучага году міжнародная (апроч С. С. С. Р.) гаспадарчая канфэрэнцыя. Яшчэ нядаўна накладалі на яе шмат надзеяў. У жніўні г. г. на міжнародных рынках, а перадусім у Нью-Ёрку, заўважылася лёгкая звыжка цэн на некаторыя сыравіны. Прэса і палітыкі усіх ахопленых крызісам дзяржаў, абвесьцілі гэта як пачатак „новага жыцьця". Тымчасам... падвышка гэтая была простым вынікам спэкуляцыі. Цэны пачалі зноў падаць. Што-ж да агульнага гаспадарчага палажэньня, дык доказам непаправы, а упадку гаспадаркі могуць быць такія лічбы: сталёвая прамысловасьць у Паўночна Амерыканскіх Злучаных Штатах выкарыстоўвае толькі 16% сваей прадукцыйнай здольнасьці, г. зн. што замест таго, каб вытвараць 100 штук нейкага тавару, вытварае толькі 16. Прадукцыя зялеза спала з 572 тысяч тонн у ліпні г. г. да 531 — у жніўні, прадукцыя самаходаў з 180611 да 89855 штук. Бюджэт мае 2 міліярды даляраў дэфіцыту. Даходы спалі у верасьні на 40%. Бэзработных 12 мілёнаў, прафэсыянальныя саюзы лічаць 14 міл. Францыя мае 12 міліярдаў франкаў дэфіцыту, даход з падаткаў корчыцца далей. Тое-ж самае, калі яшчэ ня горш, і ў іншых дзяржавах.

Зразумела, што такія весткі пахіснулі надзею на ратунак міжнароднай конфэрэнцыі у найбольш вытрывалых духам. А што, калі яна ня дасьць пажаданага выніку? Тады паводле, слоў Гэндэрсона, цяперашняга старшыні г. зв. разбраянёвай канфэрэнцыі і былага ангельскага мін. замежных спраў, гэтая гаспадарчая канфэрэнцыя „нанясе сусьветнаму даверру новы ўдар і зробіць міжнароднае палажэньне яшчэ горшым, чым цяпер яно ёсьць".

Паводле ўсіх вестак, так яно і будзе...

Для пасьпеху такой канфэрэнцыі трэба мець прынамся хоць больш менш нейкую згоду паміж яе удзельнікамі. Тымчасам паміж дзяржавамі такой згоды ўгледзіць ня можна.

Не ўспамінаючы іншых, ніяк ня могуць з сабой пагадзіцца Францыя і Нямеччына. Як ведама, сусьветная вайна кончылася паражкай Нямеччыны. Пераможнікі прызналі яе віннай у выкліканьні вайны. Налажылі на яе рэпарацыі, г. зн. абавязак плаціць адшкадаваньні за прычыненыя вайной страты сваім праціўнікам, апрача таго, накінулі цэлы шэраг агранічэньняў у збраеньні. Найбольш з усёй гэтай „ваеннай дабычы" прыпала Францыі, якая ад часу вайны пачынае іграць галоўную ролю сярод эўрапэйскіх дзяржаў і выкарыстоўвае сваё палажэньне, каб накідаць сваю волю іншым дзяржавам, а перадусім Нямеччыне, як найбольш сільнай з пераможаных. Зразумела, што з гэтым імкненьнем Францыі ніяк ня можа пагадзіцца Нямеччына, якая з свайго боку хоча вызваліцца з—пад апекі гэтай першай.

Рэзультатам гэтых стараньняў было тое, што Нямеччына амаль зусім адмовілася плаціць рэпарацыі, на што атрымала ўжо згоду сваіх праціўнікаў, а месяц таму назад зажадала раўнапраўя ўва ўсіх галінах, а перадусім у збраеньні якое (раўнапраўе) мае выражацца ў тым, што або дазволяць Нямеччыне ўзброіцца так, як яе суседзі, або яе суседзі разброяцца, як разброена Нямеччына. Для падкрэсьленьня катэгарычнасьці гэтага жаданьня, Нямеччына адклікае прадстаўнікоў т. зв. разбраенёвай канфэрэнцыі і заяўляе, што ня возьме ў яе ўдзелу, аж пакуль ня будзе прызнана для яе раўнапраўе. Такое катэгарычнае выступленьне, скірованае ўсей сваёй сілай проціў Францыі і б'ючае ў падставы яе палітыкі, як гэта можна было-б спадзявацца, мусіла-б выклікаць ня менш рашучае рэагаваньне, як з боку яе так і іншых саюзных дзяржаваў. Праўда, зацікаўленыя дзяржавы, перадусім Францыя і Англія, выказаліся агулам нэгатыўна адносна збраянёвых жаданьняў Нямеччыны, аднак згадзіліся вясьці на гэтую тэму перагаворы, г. зн. у аснове прынялі іх. Першыя спробы ў гэтым кірунку усё ж рухнулі. Арганізаваная ангельскім прэм'ерам-міністрам канфэрэнцыя 5 дзяржаў (Амэрыкі, Англіі, Францыі, Нямеччыны і Італіі) не ўдалася. Аднак далейшы ход падзеяў паказаў, што дзяржавы за ўсякую цану хочуць пагадзіцца і стварыць супольны блёк. Аб гэтым сьведчаць выступленьні ў францускім парляманце прэм'ера-міністра Эріо, які падаў да ведама новы плян разбраеньня і на які, маюць надзею, згодзіцца Нямеччына і прыступіць ізноў да працы на так зв. разбраянёвай канфэрэнцыі, якая пасьля 6 мес. „работы" стаіць на дарозе да поўнага фіаско.

Плян Эріо ў аснаўным такі: Францыя згодзіцца ў акрэсьленым тэрміне зрэдукаваць час трываньня вайсковай службы дла ўсіх родаў сухаземных войск, якія знаходзяцца ў Мэтраполіі,*) пад наступнымі умовамі: 1) усе фармацыі абапёртыя на іншых прынцыпах, як напр. райхсвэра**) будуць распушчаны, а лічба ўнутранай паліцыі будзе акрэсьлена; 2) будзе ўведзены міжнародны кантроль для нагляду над разбраеньнем.

Далейшыя менш важныя пункты адносяцца да гваранцыі, якія трэбуе Францыя ад Нямеччыны. Плян гэты, як бачым, хоць завецца разбраенёвым, але аб разбраеньні тут і духу няма. Зьніжэньне часу службы ў войску толькі павялічыць узбраеньне. бо ў каротшы час можна будзе вывучыць больш жаўняроў. Але плян гэты цікавы і тым, што ён мае за мэту перакінуць мост згоды паміж Нямеччынай і Францыяй праз скасаваньне Райхсвэры, якая мае характар прафэсыянальнай арміі і служба ў якой цягнецца 12 год, што, у сувязі з агранічэньнем яе да 100 тысяч, для Нямеччыны вельмі ня выгадна. Таму гэтая апошняя спадзяецца, што пасьля распушчэньня райхсвэры „пустое мейсца" будзе заменена адпаведнай вайсковай фармацыяй большай лікам і з карацейшай вайсковай службай. Гэтым і тлумачыцца, што паміма вострых выпадаў францускага міністра проціў Нямеччыны, урад гэтай апошняй неафіцыяльна задэкляраваў сваю гатоўнасьць вясьці перагаворы на падставе гэтага праекту. Ніхто ня мае ілюзыяў адносна таго, што усё пойдзе гладка. Будзе яшчэ шмат перашкод на дарозе да паразуменьня і можна сказаць напэўна, што п о ў н а г а паразуменьня дасягнута ня будзе, аднак Францыя і Нямеччына, а таксама ўсе іншыя дзяржавы ў абліччу супольных мэтаў і супольнага непрыяцеля зробяць усё, што магчымае, каб згаварыцца...

Ня менш важныя падзеі адбываюцца ў самай Нямеччыне. Нячуванае ў гісторыі бэзробоцьце, лічучае больш 6 мілёнаў людзей, ябніжэньне заработнай платы рабочых, моцнае агранічэньне палітычных свабод, падаткавы прэс—усё гэта давяло да надзвычайнага папружаньня грамадзкіх адно-

*) Так завецца дзяржава адносна да сваіх калёніяў.
**) Райсхвэра — назоў нямецкай арміі.

Дзе выхад?

Беларускім дзецям прыходзіцца здабываць асьвету ў вельмі, вельмі благіх матэр'яльных і маральных умовах. Пачатковых беларускіх школаў, з выкладовай беларускай мовай, ці то прыватных, ці ўрадовых амаль зусім няма. Есьць некалькі дзясяткаў школаў ні то польскіх, ні то беларускіх т. зв. утраквістычных, у якіх палова прадметаў выкладаецца папольску, другая-ж палова набеларуску, але гэтыя школы нічога карыснага для беларускіх дзяцей не даюць і ня могуць даць. У большасьці гэтых школаў вучыцялямі зьяўляюцца не беларусы, а палякі, паходзячыя „ze rdzennej Polski". Падобныя вучыцялі, як чужыя па нацыянальнасьці, ня знаюць, не разумеюць псыхолёгіі беларускіх дзяцей. Для такога вучыцеля круг думаньня, зацікаўленьне, перажываньне і наагул духовае жыцьцё беларускіх дзяцей зьяўляецца „недасьледжанай краінай". Бязумоўна, што праца падобнага вучыцеля ня будзе прадуктыўнай, бо вучыцель вучняў і апошнія вучыцеля не разумеюць. Праца яго будзе толькі тады прадуктыўнай, толькі тады ён можа даць сапраўдную веду сваім вучням, калі яны будуць узаемна разумецца. Толькі тады належна вучні будуць разумець свайго вучыцеля і апошнія вучняў, калі вучыцель ня будзе па нацыянальнасьці чужы для вучняў, калі ён будзе сапраўдным беларусам. У дадатак у гэтых утраквістычных школах пакідаецца для беларускай мовы вельмі, вельмі нязначнае мейсца. Бываюць часта і такія вучыцялі, якія ня маюць ніякага паняцьця аб беларускай мове, літаратуры, гісторыі і наагул аб беларусазнаўстве, якія зусім непаважна заглядаюцца на беларускую мову, трактуючы яе як нейкую інтрыгу, цяперашнюю выдумку. У такіх выпадках з лекцыяў беларускай мовы робяцца нейкія сьмехі, жарты.

А што-ж значаць хоць-бы гэтых пара дзесяткаў утраквістычных школаў для трох-мільённага беларускага насяленьня? Гэта, бязумоўна, капля ў моры.

Якія-ж адносіны пануюць між вучыцялямі і вучнямі ў чыста польскіх пачатковых школах у Заходняй Беларусі? Здараюцца ня рэдкія выпадкі, што дзеці бываюць у гэных школах па некалькі гадоў, але іх веда аказваецца вельмі нязначнай, бо школа гэтая зьяўляецца для іх чужой.

Як-жа выйсьці з гэтага цяжкога для беларускіх дзяцей і наагул для беларускіх масаў палажэньня? Перадусім павінны мы дамагацца адкрыцьця беларускіх урадавых школаў з выкладовай беларускай, мовай з неказённымі, а сапраўднымі беларускімі вучыцялямі, на што мы, маем поўнае маральнае і грамадзкае права. Аднячасна з дамаганьнем адкрыцьця беларускіх урадавых школаў, мы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на тое, каб школьная моладзь знаёмілася з беларускай граматай.

Абавязак гэты ў большасьці могуць споўніць толькі бацькі, калі яны зьяўляюцца пісьменнымі. Таму яны і павінны знаёміць сваіх дзяцей з беларускай граматай.

Якое-ж значэньне мае грамата ў роднай мове? Значаньне такой граматы ёсьць вялікае. Чалавек граматны ў роднай мове агрымлівае з гэтага вялікую асабістую карысьць. Перадусім ён будзе мець большыя пасьпехі ў самаразьвіцьці і ў навуцы.

Беларус, хоць ён і абзнаёмлены добра з польскай мовай, ніколі не атрымае такой карысьці з прачытанай польскай кнігі, як з беларускай. Хоць ён і знае добра польскую мову, аднак ён усяго добра ня прысвоіць, не запамятае ўсяго, як належа, заўсёды ня тое, дык другое для яго астанецца незразумелым, бо гэтую кнігу ўкладаў чалавек зусім чужы яму па нацыянальнасьці. Калі гэтак дзеіцца з Беларусам, які добра абзнаёмлены, ці-то з польскай, ці з расейскай мовамі, дык што-ж астаецца гаварыць аб такім беларускім чытачу, які толькі акончыў некалькі, ці сем аддзелаў пачаткавай польскай школы. Бязумоўна, што падобны чытач зусім мала атрымае з прачытанае польскае кнігі.

Вось колькі асабістых карысьцяў выплывае з роднае граматы. Тым большыя вартасьці ўносіць родная грамата ў скарбніцу беларускай культуры. Для беларускага народу, які знаходзіцца ў спэцыфічных умовах, асьвета ў роднай мове набірае асаблівага значаньня.

К. Чартовіч.

сінаў. Усё большыя і большыя масы пераходзяць на скрайні левы фронт і адыходзяць ад тых, якія на словах абяцаюць залатыя горы, а на справе памагаюць ува ўсім ураду. Гэта найбольш відно на прыкладзе сучаснага стану нац-сацыялістаў, г. зн. эдкрытых фашыстаў, каторыя хутчэй губяць свае уплывы, як іх здабывалі. Тое-ж наглядаецца з прыхільнікамі соц-дэмократыі, якой нічога не памагаюць левыя фразы. Аб гэтым-жа сьведчаць масавыя, салідарныя і надзвычай заўзятыя штрайкі, якія часта праходзяць у крывавых сутычках з паліцыяй. Усё гэта змушае сучасных кіраўнікоў Нямеччыны, з Прэзыдэнтам Гіндэнбургам і канцлерам Папэнам на чале, моцна ня толькі задумацца над сур'езным палажэньнем, але і прыняцца за адпаведныя мерапрыемствы. Будучы прадстаўніком інтарэсаў буйных прамысловых магнатаў і юнкраў (абшарнікаў), урад Папэна разбудовывае пры помачы войска і паліцыі дыктатуру, як адзіную магчымасьць утрымацца ў цяперашнія часы пры ўладзе. Выбары, якія праходзілі пад знаком гэтай разбудовы і якія мелі надзвычай востры прабег, толькі ілюструюць адносіны грамадзкіх сіл, а вырашэньне будучага лёсу Нямеччыны, гэта зн. таго, хто будзе панаваць, ці вайсковая дыктатура Папэна, ці якая новая сіла — яны не дадуць. Ні для каго ня ёсьць сакрэтам, а нават усе гэтага спадзяюцца, што вырашэньне ня трэба чакаць ад парляманту, але па—за ім.

Цікавасьць усіх да падзей у Нямеччыне зусім зразумелая. Тое, што там робіцца і будзе рабіцца, ня можа быць бяз уплыву на лёс іншых дзяржаў, тым балей, што і тут ідзе ня ўсё гладка. Вельмі жывым прыкладам можа быць Англія. Яшчэ зусім ня даўна ўся афіцыяльная прэса не магла нацешыцца з ахвярнасьці ангельскага рабочага, з яго патрыятызму, з таго, што ён застаецца глухі на усялякую „агітацыю". Аднак расчараваньне хоць позна, але прышло. Штрайк 200 тысяч ткачоў, нядаўныя галодныя маршы на Лёндан, барыкады на вуліцы Бэльфасту паказалі, што ахвярнасьць і патрыётызм ангельскага рабочага хутка выдыхаецца. Гэтае, шмат для каго не спадзяванае зьявішча, прымушае глыбей глянуць у сутнасьць рэчы і біць на алярм. Сапраўды ёсьць чым непакоіцца, бо такія самыя рухі заўважываюцца і ў іншых краёх. У ва ўсіх яшчэ застаецца ў памяці нядаўны штрайк бэльгійскіх гарнякоў, у часе якога сац.-дэмакратыя Бэльгіі страціла свае ўплывы, дзе рабочыя высьвістывалі яе правадыроў і рвалі партыйныя білеты...

Аглядчык.

Голас прэсы.

„Ня жыйма над стан".

31-га кастрычніка г. г., як ведама адбыўся т. зв. „дзень ашчаднасьці". Мяшчанская прэса, як віленскае абшарніцкае „Słowo", урадавы „Kurjer Wileński" і др. пасьвяцілі надзвычай шмат мейсца гэтаму сьвяту, выкарыстоўваючы яго для популярызацыі ідэі ашчаднасьці, г. зн. укладаньня грошаў у розныя банкі і касы да распараджэньня гаспадароў гэтых апошніх. „Беларуская Крыніца" з дня 30 п. м., пачуваючыся да свайго грамадзкага абавязку узяла таксама слова ў гэтым пытаньні, каб далучыць і свой голас да агульнага ашчаднасьцёвага хору. „Абгаварыўшы" агульна-гістарычнае значэньне ідэі ашчаднасьці аўтар артыкулу А. К. застанавіўся над прычынамі бяды селяніна і работніка. З паважнай мінай выкладчыка праўдзівых „лекаў на зьдзекі" аўтар, ня бачучы, быццам, сапраўднасьці, выводзіць:

> „Наш селянін і работнік працуе ад рана да вечара. Бяда яго цісьне аднак, бо ён—прызнайма! — ня ўмее быць ашчадным што да працы і часу, а ў выдатках грашавых ня ўмее адрозьніць патрэбаў першарадных, неабходных ад другарадных, а то і сусём непатрэбных, як табака, гарэлка і жыцьцё над стан. (!!!) Зразуменьня гэтых праўдаў нам не хапае. Іх трэба пашырыць ад чалавека да чалавека, паасобку і арганізавана".

І з пафосам канчае:

> Будзьма-ж ашчаднымі, прынамся, ад сягоньня. Ашчаджайма час, працу і маемасьць! Ня жыйма над стан! (падкр. наша—Рэд.).

А вось што пісала „Бел. Крыніца" ў папярэднім нумары з дня 23 кастрычніка ў артыкуле пад загалоўкам „Трагэдыя сялянства".

> „Сучаснае жыцьцё сялянства — піша аўтар п-к—і апісаць трудна. Адно гора: усё патрэбнае ў гаспадарцы і чаго селянін сам на сваёй гаспадарцы зрабіць або вытварыць ня можа вельмі дарагое, а земляробскі прадукт, жывёла, якую гадуе селянін і ўсё, што вёска вырабляе ідзе за бязцэн, чуць не задарма. Пры гэтым падаткі такія-ж самыя як і 4—5 гадоў таму назад. Гаспадарчыя даўгі, забавязаньні, на якія селянін падпісаўся 5 — 6 гадоў таму, маючы на ўвазе праз доўгія гады ашчадзіць іх і гэткім спосабам пашырыць свой зямельны варштат працы, дакупляючы 2 — 3 гэктары зямлі, заядаюць селяніна".

І канчае:

> „Словам трагэдыя, бо на гаспадарцы ня ўтрымаешся і пайсьці няма куды".

Як бачым аўтар „Трагэдыя сялянства" адкрывае нам „новыя праўды", якія ня можна пагадзіць з праўдамі папярэднімі.

Два гэтыя адрыўкі надзвычай рэльефна выражаюць падвойны характар „Б. Крыніцы". Першы з іх адбівае праўдзівую ідэалёгію Хрысьціянскай Дэмакрацыі, як прадстаўнікоў заможнейшых слоёў насельніцтва нашага краю — другі-ж напісаны на экспорт для прыкрыцьця свайго грамадзкага абліча

Перасьцярога.

Так зв. радыкальная часопісь „Беларускі Звон" у нумары з 9 кастрычніка ў перадавіцы, разважыўшы справу замаху латвійскага ўраду на Дзьвінскую Беларускую Гімназію, успомніўшы адначасова заклік „нацыяналістычна-настроенага польскага абшарніцтва ў Заходняй Беларусі да ўраду" аб вішчэньні нацыянальных меншасьцяў перасьцерагае „нацыяналістаў усіх відаў і гатункаў" у тым, што „беларуская народная маса"

> „пазбаўленая свае інтэлігенцыі — сваіх натуральных павадыроў, вельмі лёгка можа зыйсьці на такі шлях, каторага напэўна не хацелі-б бачыць нацыяналістычныя палітыкі наабапал польска-латвійскае граніцы".

Трэба думаць, што страх і сумленнае выкананьне абавязку радыкалаў, выклікаў гэтыя перасьцярогі.

Радыкалы выказваюць сваю глыбокую веру.

„Бел. Звон" у нумары з 29 кастрычніка, трымаючыся сьцісла свае радыкальнае ўстаноўкі, у перадавым артыкуле громіць паноў абшарнікаў за іх імкненьне да агранічэньня выбарчых правоў сялянства ў Гмінныя Рады. Як ведама на шпальтах „Słowo" быў надрукаваны праект самаўрадавага закону, зьмест якога зводзіцца да наступнага:

> „Гмінная Рада выбіраецца гмінным сходам. Учасьнікамі сходу зьяўляюцца а) уласьнікі 50 га. зямлі, ці гарадзкое нярухомасьці роўнае вартасьці, а таксама афіцэры рэзэрвы, якія жывуць у гміне, незалежна ад іх маемасьці, b) дэлегаты ад уласьнікаў меншае маемасьці, аб'яднаных у групы па 100 га., якія даюць адзін голас".

Называючы праект гэты „панскай ласкай", „крычачаю няроўнасьцю", „Звон" страляе ў канцы такой куляй з радыкальнай пушкі:

> „Гэта ўжо яўны зьдзек!"

І каб „не подумали плохого", зараз-жа спускае тон, выражаючы

> „сваю глыбокую веру, што дзяржаўны розум кіраўнікоў польскага гаспадарства ня пойдзе па шляху, на які заклікаюць яго, як мы ўжо ня раз казалі, збанкрутаваная гаспадарча, маральна і палітычна кляса абшарнікаў".

Фармальная і сапраўдная прычына.

Як ведама, прычыну свае дымісіі б. міністар замежных спраў Залескі тлумачыць перапрацаванасьцю і патрэбаю адпачынку. У сувязі з гэтым „Słowo" шкадуе, што Залескі не сказаў так:

> „Адыходжу, бо на жэнэўскай арэне я быў сымбалям уступак і кампрамісаў. Я дыхаў увесь прызваітасьцю і далікатнасьцю. Штрэзэманн стукаў на мяне кулаком, а я сядзеў пры стале, і пасьля так па-джэнтльмэнску захоўваўся ў адносінах да яго памяці. Вальдэмарас рабіў столькі прыкрасьцяў, а мяне ўсе хвалілі за разсудную скромнасьць. Адыходжу аднак, бо пасьля 6 гадоў працы ня бачу, каб мэтады, якія ўважаў у дыплямацыі за найбольш слушныя, выйшлі на карысьць дзяржаве, якую я рэпрэзантаваў".

У. Клімік.

На нашых землях

Вёска ня сьпіць.

Жойдзішкі, Вялейскага пав. Наша моладзь заварушылася: задумала зладзіць спэктакль-вечарыну. Выбралі дзьве п'есы: „Калісь" Аляхновіча, „Два жаніхі" Вольнага і пару вершаў да дэклямацыі. Шчыра і ахвярна пачалі рабіць рэпэтыцыі. Часу было вельмі мала. Палявыя работы. Касьба. Жніво. Нядзеляў і сьвят для ладжаньня рэпэтыцыяў было мала. Прыходзілася рабіць пробы ў буднія дні. Трэба ўспомніць, што прыгатавацца да прыстаўленьня хацелі добра. Днём не маглі рабіць пробаў, бо трэба было працаваць на полі. Пробы рабілі за агнём. Рэпэтыцыі прадаўжаліся да гадз. 12 ночы. У тыя дні, калі рабіліся пробы, артыстам прыходзілася спаць па тры гадзіны. Ужо прыгатаваліся да прыстаўленьня досыць добра Спэктакль вызначылі зладзіць на дзень 5-га жніўня г. г. у з. Мель у гумне І. Камыны. Нягледзячы на тое, што жыта было сухое і што трэба было яго вазіць у гумно, аднак І. Камына, каб не займаць гумна, адлажыў звозку жыта, якое пасьля добра перамокла. Пачалі хлапатаць аб дазволе. Па дазвол езьдзіў у старосты Б. Ч. аж тры разы. Першы раз бяз выніку.

Другім разам рэфэрэнт сказаў, каб ён прыехаў па дазвол 4 жніўня, бо раней яго ня вышле. Трудна, паехаў трэці раз.

Астаўся толькі адзін дзень да прыстаўленьня. Ці дасьць староста дазвол на яго ці не,—ніхто ня мог ведаць. Момэнтальна ў адзін дзень ачысьцілі артысты гумно, прыбралі яго ў зелень, пабудавалі сцэну. Гаспадыні ахвотна пазычылі дываноў на занавесы і ўсё ўжо было гатова. Чакалі Б. Ч. з Вялейкі з дазволам. І што-ж аказываецца? Староста ня даў дазволу на зладжаньне прыстаўленьня на дзень 5 жніўня, матывуючы гэта тым, што гумно пакрытае саломай і што яно не адпавядае гігіенічным умовам.

Варта ўспомніць, што староста пазволіў стражы пажарнай у в. Сьпягліцы зладзіць польскае прыстаўленьне нават у гумне. Выглядае так, што польскае прыстаўленьне можна ладзіць нават у гумне, а беларускае не. Неатрыманьне дазволу на зладжаньне беларускага спэктаклю, можна думаць, заключаецца ня ў тым, што гумно мае саломяную страху і што не адпаведае гігіенічным варункам, а ў тым, што моладзь хацела зладзіць ня польскае, а беларускае прыстаўленьне. Аднак наша моладзь не апускае рук і горнецца як мага да культурнай працы. Зьбліжаецца зіма. Будзе больш вольнага часу.

Вось гэтыя доўгія, манатонныя, зімовыя вечары і будуць як раз выкарыстаны для падгатоўкі новага прыстаўленьня, якое маняцца паставіць вясной.

Жойдзішны.

Свая родная газэта узмацняе і пашырае сьведамасьць народных мас. Чытайце „Шлях"!

Штрайк у фабрыцы паперы і тэктуры ў Альбэртыне.

У тутэйшых фабрыках паперы і тэктуры, як падае „Słowo" № 271, распачалі штрайк 150 работнікаў, з тае прычыны, што дырэкцыя фабрыкі адмовілася падвысіць плату.

Далей, паводле гэтага-ж „Słowa" № 279 эканамічны штрайк альбэртынскіх работнікаў закончыўся 3 г. м. на карысьць апошніх. Наступіла паразуменьне між работнікамі і дырэкцыяй фабрыкі, каторае палягае на тым, што дырэкцыя фабрыкі падвысіла плату на 20 зл. на цэлы стан работнікаў у дзень і на 200 зл. месячна для найбеднейшых работнікаў, каторыя з прычыны недахопу працы будуць найменш працаваць.

„Фабрыка фальшывых манэтаў.

Беспрацоўны сталяр Пётра Тэрэцько паразумеўшыся з таксама беспрацоўным кавалём Адамам Місьневічам залажылі фабрыку фальшывых манэтаў у в. Хайнякі гм. Вішнеўскай. Сродкі для сконструованьня гэтай „фабрыкі" яны здабылі з прадажы сваіх нялічных рэчаў. Спачатку пусьцілі яны ў рух 50 гр., пасьля 1 зл. і 2 зл. манэты. Але скора паліцыя накрыла гэту фабрыку, гдзе, падчас рэвізіі, знашла 15 штук манэтаў па 1 зл. і 18 штук па 2 зл.

Напад жанчын на мельёрацыйную камісію

У мястэчку Груздова, Пастаўскага павету прыехала мэльёрацыйная камісія Зям. Вокр. на чале з тэхнікам. Ніхто ня ведаў, чаго яна прыехала і што будзе рабіць. Нехта пусьціў чуткі, што яна мае праводзіць дарогу праз вясковае пасьбішча. Калі тэхнік прыступіў да працы, вызначыў мейсца, выцягнуў ланцуг, нагавораныя жанчыны ў ліку 150, накінуліся на тэхніка і пачалі біць. Нехта з камісіі паклікаў паліцыю, якая з вялікім трудом успакоіла жанчын.

(„Kur. Wil." 28. X. 32).

Мітынг пасла Махая у Баранавічах.

Цэпэсовец пасол Махай зрабіў мітынг у м. Баранавічах, каторы меўся быць „вялікай маніфэстацыяй безпрацоўных" і стварэньнем праз іх „агульнага фронту". Такія прынамся, меў пляны організатар. Сапраўднасьць паказала адваротнае.

Замест спадзяваных масаў рабочых, зьявілася на мітынг пара дзесяткаў яўрэяў, якія пасьля прамовы і адчытаньня рэзалюцыі, запяялі „Інтэрнацыянал" і разышліся. („Słowo" 28. X. 32.).

Суд за кам. дзеяльнасьць.

У „Słowie" № 271 даведываемся, што акружны суд у Горадні на выязной сэсіі ў Слоніме разглядаў справу І. Тамашэвіча, Мік. Куцькі, Макс. Куцькі з в. Абронская Вулька, Косаўскага павету, абвінавачаных у камуністычнай працы.

Суд засудзіў: Ігнася Тамашэвіча на 5 гадоў вастрогу і пазбаўленьне правоў на 10 гадоў, Мік. Куцьку на 4, Макс. Куцьку на 2 г. вастрогу з пазбаўленьнем правоў на 5 г. і Янку Тамашэвіча на 1 год арышту.

Адусюль па трошку.

Дэманстрацыя безработных у Бжэзінах.

Як падае „Robotnik“ у г. Бжэзінах (Верхвія Сілезія) дня 2 г. м. адбылася дэманстрацыя 600 безработных супроць зьменшаньня на палову даваных дапамог.

Студэнцкія дэманстрацыі ў Варшаве.

27-X на панадворку Варшаўскага Унівэрсытэту сабралася каля 2000 студ. з мэтай наладзіць мітынг супроць падвышкі плат паміма забароны рэктара. Пасьля выступленьня некалькіх прамоўцаў, студэнты з лёзунгамі: „Да міністэрства! Няхай жыве штрайк процi аплатаў“! — пачалі выходзіць з панадворку, каб дэманстраваць перад Міністэрствам Асьветы. Паліцыя пры разганяньні дэманстрантаў ужывала матрнай помпы. 15 студэнтаў было затрымана.

Штрайк консумэнтаў электрычнага току.

2 г. м. распачаўся ў Бельску і Бялэй штрайк консумэнтаў электр. току скіраваны процi лішне вялікай яго цане, назначанай электроўняй у Бельску. У штрайку бярэ ўдзел большасьць жыхароў абаіх гарадоў. Электроўня не згаджаецца на ўрадавы арбітраж (вырашэньне справы ўрадам).

Аб незалежнасьці вышэйшых школ.

З гутаркі прадстаўніка Агенцыі „Iskra“ з п. мін. асьветы Енджэевічам даведываемся, што Ўрад мае правесьці рэформу вышэйшых школ на некарысьць незалежнасьці Унівэрсытэтаў. Пан мін. сказаў, што ў справы навуковыя Урад ня будзе ўмешвацца і пакідае тут поўную аўтаномію (незалежнасьць), але справы ўзгадаваньня студэнтаў і адміністрацыйна-гаспадарчыя справы Урад поўнасьцю мае ўзяць на сваю руку.

Амністыя.

На падставе дэкрэту п. Прэзыдэнта звальняюцца ад кар асобы засуджаныя на 6 мес. і ад адпаведных кар грашыма. Амністыя не датычыць праступкаў процi войска, процiў дзяржаўнага ладу (камуністаў), дзяржаўнага скарбу і т. п.

Забурэньні ў Ліпінах.

(Сьвентохловіцкі пав.). Як падае „Robotnik“ у гэтым м-ку некалькі сот безработных з прычыны зьменшаньня на палову помачы зарганізавалі дэманстрацыю, прычым былі напады на спажывецкія скляпы. На заўтра забурэньні паўтарыліся.

Выбарчы месяц.

6 г. м. адбыліся выбары ў Нямеччыне (новы парлямант), будуць выбары прэзыдэнта ў Злучаных Штатах Паўночнай Амэрыкі, 16 парляманцкія выбары ў Даніі, а 27 у Бэльгіі.

Забастоўка 200.000 ткачоў.

Дня 31-IX г. г. тэкстыльшчыкі Лянкаширскага вокругу (Англія) ў ліку 200 тысяч прыступілі да забастоўкі на знак пратэсту процiў абніжэньня платы.

Японія адмаўляецца ад пакту неагрэсіі (ненападаньня) з С.С.С.Р.

Японскае міністэрства замежных спраў пастанавіла, што ў цяперашні мамэнт пакт аб неагрэсіі з СССР не зьяўляецца неабходным і таму трэба справу гэту адлажыць на далей.

Паход кітайскай чырвонай арміі.

„Наше Время“ з дня 30-IX г. г. падае: Паводле японскіх паведамленьняў кітайская чырвоная армія прыбліжаецца да правінцыі Фу-Дзян. У паведамленьні гаворыцца, што павялічаныя сілы чырвоных, згрупаваны ў правінцыі Дзян-Сі, пасунуліся наперад у кірунку паўночнага ўсходу, займаючы тэрыторыю Шун-Чана і Узя-Нена.

Гітлер траціць прыхільнікаў.

Газэты падаюць, што Гітлер траціць сваіх прыхільнікаў і прытым у больш шпаркім тэмпе, чым іх здабываў. І так ува Ўсходняй Прусіі яшчэ 6 месяцаў таму назад ня было ні воднай залі якая-б зьмясьціла ўсіх слухачоў нац.-сацыялістычнага мітынгу. Калі-ж ён цяпер выступаў з прамовай у Кэнінгсбэргу, дык у залі пуставала некалькі сот мейсцаў. У красавіку Гітлер прамаўляў у Галіі ў прысутнасьці 100 тысяч слухачоў, а цяпер сабраў толькі 10 тысяч. Раней браў за ўход ад асобы ад 5 да 10 марак, а цяпер ад 10 фэн. да 40 фэнігаў.

Галодныя бунты ў Гішпаніі.

У многіх гарадох Гішпаніі адбыліся апошнімі часамі паважныя бунты безработных. Так у г. Бадайозе натоўп безработных уварваўся ў лепшую рэстаўрацыю гораду з крыкам „ежы і працы“. Яны пазабіралі ў рэстаўрацыі ўсе спажывецкія прадукты, а пасьля пайшлі рабаваць булачныя.

Грамадзяне! Выпісвайце і пашырайце сваю народную газ. „Шлях“!

ГАСПАДАРКА.

Палітыка і гаспадарка.

Гаспадарчыя труднасьці, якія вырасьлі на грунце ўжо трэці год цягнучагася эканамічнага крызісу, прымусілі зацікавіцца гаспадарчым пытаньнем ня толькі фаховых эканамістаў, але і палітыкаў ды нават „простых“ людзей. Розна тлумачаць фахоўцы і не-фахоўцы прычыны крызісу. Усе аднак сходзяцца на адным пункце, што крызіс гэты вельмі і вельмі пагражае сучаснаму эканамічнаму і грамадзкаму ладу. Бо няма сумліву, што крах на гаспадарчым фронце прынясе з сабою крах і на палітычным. Залежнасьць палітыкі ад гаспадаркі відна ў гэтым выпадку як ня трэба ляпей. Ад гэтуль і цікавасьць да пазнаваньня гаспадарчых падзеяў, якія адбываюцца на ўсім сьвеце, каб зрабіць адпаведныя палітычныя вывады. Што прынясе з сабою крызіс? Ці сучасны лад разваліцца пад яго ударамі, ці яшчэ здолее вытрываць перад яго напорам? — Вось пытаньні, на якія сіляцца адказаць, кожны па сваіх здольнасьцях і сілах, тысячы і мільёны людзей.

Будучы перакананымі, што над адказам гэтым не адзін і з нашых чытачоў думае і хоча думаць, уводзім тут на гэтым мейсцы аддзел прысьвечаны цалком гаспадарчаму жыцьцю. Тут мы будзем падаваць артыкулы, розныя весткі адносячыяся да гаспадарчага палажэньня сьвету, а ў асаблівасьці нашага краю г. зн. Зах. Беларусі. Пры тым будзем падбіраць матар'ял так, каб ён быў даступны найбольшаму ліку нашых чытачоў і каб на яго падставе можна было-б зрабіць тыя ці іншыя вывады.

Лічым патрэбным зазначыць, што рэдакцыя ня імкнецца да таго, каб усё даць у гатовым выглядзе, з адпаведнымі вывадамі. Хочам, каб кожны чытач самастойна думаў над пададзенымі матар'ямі. Адначасна заклікаем дзяліцца з намі сваімі спасьцярогамі і думкамі.

Ліквідацыя цукровых заводаў.

Як падаюць газэты, 10 цукровых заводаў на тэрыторыі варшаўскага ваяводзтва пастанавілі у г. г. не аднаўляць працы з прычыны цяжкага фінансовага палажэньня.

У Горадні.

Дзяржаўная фабрыка табакі скараціла лік рабочых дзён з 6 на 5. „Сьвяточным“ днём мае быць панядзелак.

Сусьветны гандаль.

Зварот заграничнага гандлю 48 найважнейшых дзяржаў ахопліваючых $^7/_8$ сусьветнага гандлю ўпаў у першай палове г. г. да цыфры 51 мільярда марак (107 мільярдаў зл.) у параўнаньні з 126 мільярдамі м. у 1929 г., калі гандаль асягнуў найвышэйшую ступень разьвіцьця. У параўнаньні з першым паўгодзьдзем 1931 г. прывоз у першым паўгодзе 1932 г. упаў у Польшчы, Аўстрыі, Даніі, Швэцыі, Нарвэгіі і Літве на 40% і больш; у Латвіі на 60%, у Вэнгрыі на 58%, у Югаславіі на 49%, у Нямеччыне, Англіі, Бэльгіі, Голяндыі, Эстоніі, Румыніі і інш. ад 30 да 40%. Так-сама ўва ўсіх гэтых дзяржавах упаў вываз на 30—40%.

Ад Адміністрацыі

Першы нумар нашае газэты разсылаецца, як пробны, бязплатна. У далейшым будзем пасылаць толькі тым, хто прышле падпісную плату, якая выносіць усяго 50 грошай на месяц. Грошы слаць на адрас: Wilno, ul, Litewska 25—1. Redakcja „Szlach“.

Віленская хроніка.

— **220 злотых у год.** Сялетняю восеньню, 2 апошнія беларускія гімназіі ў Вільні і ў Навагрудку, сталіся поўнай уласнасьцю дзяржавы і, такім чынам, згубілі сваю самастойнасьць. Цяпер Віл. Белар. Гім. зьяўляецца філіяй польскай гімназіі ім. Славацкага, а Навагрудзкая філіяй таксама такой-жа гімназіі ў Навагрудку. Таму, што гэтыя гімназіі перайшлі цалком на кошт дзяржавы, плата за навуку ўва ўсіх клясах падвысілася да 220 зл.

Вось тут і вучыся.

— **Новая польская газэта.** Студэнты Віленскага Унівэрсытэту Сьцяп. Баторага, як падае „Słowo“ № 275, Капала і Рынец, належучыя да кампаніі п. Ендрыхоўскага, выдалі газэту пад назовам „Razem“. Яны прадстаўляюць сабою левы адлам „Legjonu Młodych“.

— **Самабойства адвакацкага апліканта.** З 4 на 5 уночы г. м. скончыў сваё жыцьцё праз самабойства адвакацкі аплікант Самуэль Кацэў. Кацэў быў, як даносіць „Słowo“ № 279, у сваім часе падазроны ў камунізьме, што, як быццам, вельмі дрэнна адбілася на яго кар'еры. Акалічнасьці гэтыя так падзеілі на яго, што ён, ня маючы надзеі на паправу сваёй апініі, рашыў пакончыць з жыцьцём.

— **Прыплыў падаткаў усьцяж зьменшываецца.** Паводле правізарычнага абліčэньня падаткавага аддзелу ў прошлым месяцы ўплыло да мястовай касы розных камунальных належнасьцяў 45 проц. таго, што было ў гэты час запрэлімінована да заплаты. Заўважываецца, такім чынам, у надатк. прыплывах зьніжковая тэндэнцыя.

— **Засыпаюць просьбамі аб помачы.** Да аддзелу грамадзкай Апекі Магістрату, наплывае вялікая маса заяваў, у якіх просяць беспрацоўныя грашовай дапамогі. Што дзень застаюцца разгледжанымі больш як 100 такіх заяваў. З прычыны той, што сродкі, якімі распараджаецца грамадзкая апека, ёсьць абмежаваныя, далёка ня ўсім просячым ідзецца на сустрэчу.

Маса складаных заяваў ёсьць паказчыкам таго, што гаспадарчая дэпрэсія і абядненьне мас што раз то больш і больш павялічваецца.

— **Два прыгавары на сьмерць.** Акружны Суд у Вільні з г. м. разглядаў справу 22-гадовага Станіслава Маркоўскага па фаху сталяр, сталага жыхара м. Ліды, 29 гадовага Дымітра Сая — земляроб, бацька 3 дзяцей, брата Маркоўскага 28-гадовага Рышарда Маркоўскага, таксама жыхар м. Ліды, сталяр., 32-гадовага Пётра Русака, земляроб, бацька 4 дзяцей, якія абвінавачваліся ў шпіянажы.

Суд засудзіў Ст. Маркоўскага і Дымітра Сая на кару сьмерці праз павешаньне, а двух апошніх на бязтэрміновы вастрог.

Абвінавачаныя прынялі прыгавар раўнадушна.

Абаронцы Ст. Маркоўскага і Д. Сая выслалі тэлеграфічна просьбу да п. Прэзыдэнта аб памілаваньні. П. Прэзыдэнт не скарыстаў з права ласкі і засуджаныя на кару сьмерці Ст. Маркоўскі і Дымітр 4 г. м. былі павешаныя ў падвалах Лукішак.

— **„Прадукцыя“ расьце.** У Вільні, як падае „Бел. Звон“ арганізуецца новая культурна-асьветнае т-ва пад назовам „Т-ва Беларускае Асьветы“. Ні для каго ня ёсьць тайніцай, што ініцыятарамі гэтага новага т-ва зьяўляюцца беларускія санатары — радыкалы. Кажуць, што крызіс пануе на сьвеце.

Бюлетэнь Т-ва Бел. Шк.

Больш як месяц таму назад вышаў другі Бюлетэнь ТБШ з датай 28 верасьня г.г. Сам факт выхаду яго, сьведчыць аб пэўным ажыўленьні дзеяльнасьці, як Галоўнай Управы так і паасобных гурткоў ТБШ. І сапраўды, з аддзелу „Хроніка Т-ва“ даведываемся аб тым, што паасобныя арганізацыі Т-ва, паміма раду труднасьцяў, вядуць актыўную, культурна-асьветную працу.

Перадавы артыкул Бюлетэню дае прынцыповае становішча ТБШ ў справе супрацоўніцтва яго з польскімі грамадзкімі арганізацыямі, заініцыяванага Беластоцкім Ваяводзтвам. ТБШ, прынцыпова стоячы на грунце „супрацоўніцтва беларускіх працоўных масаў з польскімі на асьветнай ніве“, адносіцца да запрапанаванага супрацоўніцтва нэгатыўна, паколькі яно праводзіцца зьверху адміністрацыйнымі ўладамі, ня носіць характару ўзаемнага паразуменьня паміж сабою роўнапраўных арганізацыяў і паколькі яно можа перашкаджаць у працы бел. арганізацыяў „у кірунку дасягненьня сваіх безпасрэдніх культурна-нацыянальных заданьняў“.

Аднак трэба зазначыць, што ў артыкуле ёсьць мамэнты, якія гэтае прынцыповае становішча замяняюць. І так чытаем: „Паўтараем, што супрацоўніцтва ня можна насадзіць адміністрацыйнымі загадамі. Яно само спатыкаецца, дзе ёсьць адпаведныя настроі ў грамадзянстве, як гэта мы бачым на зьмешчаным ніжэй прыкладзе Ельцаўскага гуртка ТБШ і мяйсцовай пажарнай стражы і яно будзе разьвівацца пры спагадных умовах праўнага і грамадзкага характару“. Як бачым, паважная справа супрацоўніцтва тут зводзіцца да справы „адміністрацыйных загадаў“ і „настрояў у грамадзянстве“ тым балей, што „супрацоўніцтва“ Ельцаўскага гуртка выражаецца толькі тым, што ён наладзіў бел. спэктакль у памяшчэньні пажарнай стражы і пры помачы апошняй. Далей зусім не зразумелы такі сказ: „Ворган польскай партыі соцыялістычнай „Robotnik“ толькі ў апошнія часы ўдзяляе ўвагі нашым культурным справам у спагадным для нас сэнсе“. Сапраўды рэдактары „Robotnika“ ўсьмехнуліся-б, калі-б прачыталі Бюлетэнь, бо яны, апроч пару вестак паходзячых ад пэўных асоб бел. грамадзянства, нічога ніколі не зьмяшчалі, а калі і зьмяшчалі дык напэўна не з „спагаднасьці“. Гэтыя няяснасьці паслужылі повадам для няспрыяючых Т-ву газэтаў да несумленных вывадаў з мэтай кампрамітацыі яго ў вачох бел. грамадзянства, як гэта зрабіла „Бел. Крыніца“ ў артыкуле „Камо грядеши?“ (Куды ідзеш?). К.

Рэдактар-выдавец: К. Чартовіч.

Друкарня Я. Баеўскага, Вільня, вул. Мастовая 9.